# ЛЮБОЎНАЯ ЛІРЫКА НІНЫ МАЦЯШ («МЫ ЎСЕ – З ЛЮБОВІ, УСЕ МЫ – ДА ЛЮБОВІ»)

***В. М. Кірылава***
*УА «Мінскі гарадскі педагагічны каледж», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – А. К. Пекач,*
*выкладчык, настаўнік-метадыст*

**Анатацыя.** У артыкуле аналізуецца любоўная лірыка Ніны Мацяш: вызначаецца сутнасць паняцця «каханне»; паказваецца вера лірычнай гераіні ў сапраўднае і чыстае каханне; выяўляецца арганічная сутнасць жанчыны, для якой самая высокая мера – каханне; раскрываецца ўнутраны, духоўны свет лірычнай гераіні, якая спазнала сапраўднае каханне.

**Ключавыя словы:** Ніна Мацяш; любоўная лірыка; каханне; узаемнасць; душа; чуласць, шчырасць, радасць, сардэчнасць; боль, слёзы, перажыванні.

Шчасце, радасць, паразуменне, боль, рэўнасць, давер… Усё перакрываецца такім блізкім, але ў той жа час недасягальным, такім важным і простым словам – каханне! Чалавек, чыё сэрца не закранула сапраўднае, шчырае каханне, чалавек, які не кідаўся з галавой у яго вір, не мог спазнаць усёй паўнаты жыцця, дакрануцца да самага галоўнага, незвычайнага і цёплага цуду свету.

Паэзія Н. Мацяш – незамутнёная крыніца красы, да якой прыпадаеш, перажываючы радасць і сум чалавечага быцця на зямлі. Лірычны свет гераіні ўвесь вытканы мовай кахання і любові. І ў гэтым бачыцца арганічнае выяўленне сутнасці жанчыны, для якой самая высокая мера – каханне.

Каханне для лірычнай гераіны Ніны Мацяш – гэта пачатак і канец існавання. Гэта зямля, якая ў канцы шляху прымае цела чалавека ў свае абдымкі, і неба, да якога цягнецца душа. А паміж імі распасціраецца ўвесь унутраны свет гераіні, уся яе сутнасць:

Вы ёсць. Як пад нагамі ёсць зямля.
Як гэта неба ёсць над галавою.
Вы – нібы гарызонт, які здаля
Са мной жартуе блізкасцю сваёю.

А я прымаю жарты за сур’ёз.
То не самападман. То проста веры
У маю сутнасць. І пакуль Вы ёсць,
Мой шлях адзін, мой шлях – наперад.

[«Вы ёсць», 2, с. 50].

У вершы «Сугучча» каханага лірычная гераіня параўноўвае з жаўранкам – саюзам неба і зямлі, сімвалам юнацкага запалу і радасці, а таксама са шпаком – сімвалам сонца, вясны, неба, ветру і свабоды:

...І ўсё той жа –
Пяшчотны, ўсмешлівы, шчаслівы,
Увесь у песеннай уладзе –

Як жаўранак над яснай івай,
Як шпак у развяснелым садзе!..
Ты ўсё, усё мне,
Ўсё на свеце:
І кліч жыцця,
І прага смерці…

[«Сугучча», 1, с. 116].

У вершы «Любоў» белаазёрская паэтка коратка, але ярка і лаканічна дае зразумець, што каханне і ёсць жыццё. Каханага яна параўноўвае з зернем – сімвалам існавання, пачатку і канца жыцця. Паводле меркавання лірычнай гераіні Н. Мацяш, толькі маючы каханне, можна вырасціць добрае і прыгожае:

Той час, які прасякнуты табою… –
Адно ў той час бываю я жывою.
Адно тады напэўна знаю я:
Не марна доля доўжыцца мая.
Не марна выпрабоўвае сурова:
Ты зерне ў ёй.
Астатняе – палова.

[«Любоў», 1, с. 75]

Так, як зерне зрастаецца з зямлёй, лірычная гераіня Н. Мацяш зрастаецца з каханым. І гэтак жа, як збожжу патрэбна ўрадлівая і падыходная глеба, чалавеку патрэбен той, хто адкрые яму сваё сэрца і душу, хто пойдзе насустрач, прылашчыць. І тады народзіцца сапраўднае каханне, якое назаўжды зможа аб’яднаць закаханых. Каханне, якое ўздыме іх пачуцці, як сцяблiну жыта, да неба, а потым у выглядзе зярнятка зноў пахавае ў абдымках зямлі. Але, нягледзячы на ўсе перараджэнні, каханне жыве, бо яно бясконцае:

Я ўжо ў цябе ўрасла.
Мы ўжо зрасліся.
Гады спатрэбіліся,
Доўгія гады,
Каб зразумець, што дзвюм істотам
З адзіным сэрцам і кровазваротам
Жахліва быць у паасобку,
Немажліва.
Сыходзяць леты.
Усё вышэе строма шчасця нашага,
Якая ўзносіць нас.
І пахавае.

[«Строма», 1, с. 121].

Каханне часта прыносіць не толькі шчасце, радасць і цяпло. Боль, слёзы, перажыванні таксама непадзельныя з ім. Бо калі каханне можна параўнаць з самім жыццём (а для жанчыны яно і ёсць жыццё), то немагчыма ўявіць толькі сонечныя і радасныя дні, якія не наведваюць дажджы, снягі і хваробы. І ўсведамленне гэтага палохае лірычную гераіню Н. Мацяш, жанчына баіцца прывязацца, прырасці да любага, бо тады ёй не абмінуць болю любові:

Не трэба, дружа, не свяці
Ты мне любоўю:
Баюся сэрцам прырасці,
Баюся болю.

[«Не трэба, дружа, не свяці…», 1, с. 73].

Лірычная гераіня не жадае хаваць сваіх пачуццяў, выдаваць спякотлівае лета за сцюжную зіму, бо каханне – гэта цуд, кахаць – рэдкі талент. А тыя, хто спрабуе ахаваць сваё жыццё ад гэтага чароўнага пачуцця, агароджваюць сябе і ад цяпла, якое вогнішча кахання дорыць людзям, што без астатку аддаюць сваё сэрца іншаму чалавеку:

Мой каханы!
Я не ўмею гэтак.
Не па мне наўмысна, ясны мой,
Пачуцця спякотлівае лета
Абарочваць сцюжнаю зімой.

[«Кажуць: трэба…», 1, с. 104].

Таму, хто кахае, вядома, што шчаслівай можна назваць толькі тую дарогу, якая вядзе цябе да каханага чалавека. Часам людзі губляюцца сярод тысяч невядомых дарог і сцяжынак – шырокіх і вузкіх, усыпаных сцюдзёнымі снягамі або золатам сонечнай лістоты, працятых тонкімі раўчукамі вясны, якія нараджаюць выдатныя мелодыі прыроды. Таксама людзі губляюцца і на дарогах, схаваных у глыбіні іх душы. Глыбока ўнутры жывуць сцяжынкі страху, зайздрасці, шчасця і мараў, але ёсць адна дарога, ідучы па якой, сэрцы людзей абавязкова сустрэнуцца. Гэта дарога любові і ўзаемнасці, дарога кахання. І радаснае жыццё таго чалавека, які пойдзе па ёй насустрач каханаму. Пра гэта Н. Мацяш напісала ў вершы «Не ў Рым вядуць дарогі»:

Не ў Рым дарогі ўсіх людзей вядуць,
А да вякамі снёнай узаемнасці.
Не бачыла, як ты масты свае масціў,
Ды помніла, што я цябе знайду.

[«Не ў Рым вядуць дарогі» 1, с. 258].

Каханне, чаканне… Гэтыя словы неаддзельныя адзін ад аднаго. Тыя, хто любіць, заўсёды чакаюць каханага. Чакаюць яшчэ да сустрэчы ў рэальнасці, чакаюць з далёкіх краін, чакаюць з працы, чакаюць, калі каханы адыходзіць усяго на пару хвілін. Лірычная гераіня Н. Мацяш параўноўвае сябе з жаўранкам, які чакае світання, каб заспяваць сваю цудоўную песню. Світанне для яе – каханы чалавек. А калі не будзе яго, то не будзе і сонца, ніколі не наступіць дзень:

Чакаю цябе. Так жаўронак світання чакае,
З чужой чужаніцы дадому вярнуўшыся ўночы.
Чакаю цябе. У сваім неспакоі блукаю,
Які мне то памяць тваю, то няласку прарочыць.

[«Чакаю цябе…», 1, с. 59].

У жыцці лірычнай гераіні Ніны Мацяш наступае пара мудрай сталасці, калі не заўсёды ўсё тое, што адчувае сэрца, адкрыта падаецца ў паэтычных радках. «Мая пара спяванак, мук, надзей перарасла ў пару маўклівых дум», – сцвярджае лірычная гераіня. Яна просіць прабачэння ў каханага:

Не злуй і ўпотай не раўнуй, калі
Маёй любові гімны не гучаць.
Нам безвыходства ўжо не так баліць.
Ужо лягчэй мне... Хочацца маўчаць.

[«Умее Час, вялікі дабрадзей...», 1, с. 177].

Але стрыманасць не азначае абыякавасці. У ёй – глыбокае спасціжэнне самой існасці кахання, як «боскага дару», бяссмерця дваіх: Яе і Яго, жадання вярнуць удвая больш таму, хто запаліў у душы лірычнай гераіні агонь кахання і каго яна называе «Бог», «мой Сусвет» («Боскі дар»). У кароткім афарыстычным вершы «Да пытання пра каханне» паэтка сцвярджае:

З каханнем – як з Богам:
Альбо ёсць вера ў яго існаванне,
Альбо на свеце няма нічога такога.

[«Да пытання пра каханне», 2, с. 121].

Нягледзячы на тое, што пачуцці лірычнай гераіні то «прарастаюць пакутай», то спяваюць у сэрцы «жаваранкамі пяшчоты», яна пераканана, што:

Мы ўсе – з любові, ўсе мы – да любові,
А як жа мы прад ёю ўсе ў даўгу!..

[«А можа, ўдасца, мо сябе ўтаймую, 2, с. 190].

Вера лірычнай гераіні ў сапраўднае і чыстае каханне значна мацнейшая за непаразуменні, якія прыходзіцца вынесці чалавеку. У каханне і любоў трэба верыць, і тады яны здольная выратаваць душу.

У апошнім зборніку Н. Мацяш любоўная лірыка мае трагічна-сентыментальны характар. Але, нягледзячы на гэта, вершы працятыя яркімі нотамі веры ў сапраўднае каханне, у тое, што яно здольнае выратаваць чалавека ад праблем, вывесці на дарогу святла і дабра, уваскрасіць яго душу. «Трымацца скалы Любові» – такі дэвіз пакінула пасля сябе белаазёрская паэтка, бо толькі «скала Любові» здольная вытрымаць самыя страшныя стыхійныя бедствы. У вершы «Птушкі і гнёзды», прысвечаным Я. Брылю, Н. Мацяш параўноўвае беларускага пісьменніка з Магутным Птахам, гняздо якога знаходзіцца на скале Любові. А, як вядома, птушка – гэта сімвал неба, сонца і вышыні духу. Скала – сімвал непахіснасці, сталасці і трываласці. У злучэнні два гэтыя сімвалы дапаўняюць адзін аднаго. Крохкасць знаходзіць апору, а сіла і сталасць здабываюць лёгкасць і бязважкасць. Гэта і ёсць Гармонія:

Гняздо *Магутнага Птаха*
было на скале *Любові* –
адзінай скале нясхіснай
у цёмных вірах стыхіяў

[«Птушкі і гнёзды», 3, с. 23].

Паэтка разумее, што трымацца скалы Любові можа далёка не кожны. На гэта здольныя толькі моцныя, высокія духам, тыя, каго ў любой жыццёвай сітуацыі можна назваць Чалавекам:

Не ўсякая ж птушка ўмее
сяліцца і жыць высока,
трымацца скалы *Любові*
ў цёмных вірах стыхіяў.

[«Птушкі і гнёзды», 3, с. 24].

Тэма кахання набывае абрысы абагульнення ў вершы «Amo te» з эпіграфам «Amo te, ama me, fides immortales»: «Люблю цябе, любі мяне, вернасць бессмяротная» – якраз гэты выраз старажытныя пісалі на заручальных пярсцёнках:

Па жыцці не прайсці,
Каб не зведаць бяды.
Нам бы ж толькі пярсцёнкі шапталі
Праз вясну і праз слоту,
Праз сівыя гады:
AMO TE,
AMA ME,
FIDES IMMORTALES.

[«AMO TE», 2, с. 37].

Такім чынам, любоўная лірыка Ніны Мацяш стварае цэлы свет, поўны чуласці і шчырасці, утоеных перажыванняў і сардэчных адкрыццяў. Вершы белаазёрскай паэткі неверагодна дакладна і пранікнёна апісваюць духоўны свет жанчыны, якая спазнала сапраўднае каханне. Ад рамантычнага зараджэння светлых і глыбокіх пачуццяў да іх укаранення, поўнай улады над сэрцам лірычнай гераіні, ад вясновых шчаслівых палётаў да доўгіх і цяжкіх перажыванняў, ад жыцця да смерці ахоплівае паэзія Ніны Мацяш тэму кахання. І не так важна, ці прынясе гэтае высокае пачуццё шчасце. Яно абавязкова адродзіць душу чалавека, дазволіць яму лепш разумець сябе і свет, наблізіць яго да нябёсаў, да бясконцасці. І да высокасці.

## **Бібліяграфічны спіс:**


1. Мацяш, Н. Душою з небам гаварыць / Н. Мацяш. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 462 с.
2. Мацяш, Н. Паміж усмешкай і слязой / Н. Мацяш. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 301 с.
3. Мацяш, Н. У прыгаршчах ветру / Н. Мацяш. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2009. – 144 с.